Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №25 (372)

■ Прэм'ера

# АРЛЫ І КАХАННЕ



Прэм'ерай балета «Ор і Ора» завяршыўся 84-ы тэатральны сезон у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. Расійска-беларускі праект тэатр рэалізаваў праз супрацоўніцтва з прадстаўнікамі тэатра «Кілізэ» з Санкт-Пецярбурга.

Літаратурная аснова пастаноўкі — твор «Арлы і людзі» — напісаны чалавекам з разнастайнымі інтарэсамі: бізнесменам, мецэнатам, прафесарам, членам Пецярбургскага саюза мастакоў і Пецярбургскага саюза пісьменнікаў, а таксама кіраўніком тэатра «Кілізэ» Вячаславам Заранковым. Калісьці на Кіпры ён быў сведкам дзіўнай гісторыі кахання: вялікі арол прыляцеў у горад, разбіў акно на балконе суседзяў і... выпусціў на волю арліцу, якую трымалі ў кватэры. Пісьменнік даведаўся, што птушкі належалі мужу і жонцы. Яны пасварыліся, падзялілі пітомцаў ды раз'ехаліся па розных гарадах, але арлы не пагадзіліся жыць паасобку і знайшлі адно аднаго. Адданасць птушак кранула закаханых: у хуткім часе яны памірыліся. Прыгожая гісторыя спачатку стала апавяданнем, а потым ператварылася ў лібрэта, падрыхтаванае сумесна з харэографам, балетмайстрам-пастаноўшчыкам Аляксандрай Ціхамiравай. Аўтары лібрэта прызналіся, што знайсці ўзаемаразуменне атрымалася не адразу, але вынікам сумеснай працы цалкам задаволеныя. Дзеянне гісторыі перанеслі з Кіпра ва ўмоўную прастору: на спектакль у яго ствральнікаў вялікія планы. Балет «Ор і Ора» зладзілі на радзіме Вячаслава Заранкова, у Беларусі.

— У Вялікім тэатры Беларусі выдатны калектыў, — адзначыў Вячаслаў Заранкоў. — У Мінску нашу прапанову сумесна паставіць балет прынялі з вялікай увагай, праслухалі музыку, прачыталі лібрэта. Генеральны дырэктар тэатра Вадзім Грыдзюшка адчуў, хто зможа паставіць балет.

Аркестровая прэм'ера балета адбылася ў 2016 годзе ў Санкт-Пецярбургу, пасля наведала месца, дзе нарадзілася ідэя твора, — Кіпр. Версія, якая прагучала на сцэне беларускага Вялікага, адрозніваецца ад першапачатковай. Музыку да балета, напісаную расійскім кампазітарам і мастацкім кіраўніком тэатра «Кілізэ» Міхаілам Крыловым, апрацавалі пад форму танца: музычную рэдакцыю і аркестроўку зрабіў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі кампазітар Алег Ходоска. «Птушыная» тэма часта адлюстроўваецца ў балеце (дастаткова згадаць тое ж «Лебядзінае возера»), але знаўцы музыкі дакладна пазнаюць спасылкі і на іншыя музычныя творы.

— У балеце «Ор і Ора» на адну партыю даводзіцца не адзін-два саставы, а ажно шэсць. — заўважыла Аляксандра Ціхамірава. — Кожны з артыстаў па-новаму падае матэрыял, прыўносіць у пастаноўку нешта асабістае.

У спектаклі адлюстравана гісторыя людзей ці не з моманту стварэння свету. За дзве дзеі мы бачым з'яўленне людзей, першае вяселле і першую сварку, пакуты адзіноты і весялосць начнога клуба, зайдрасць і забойства, нарэшце, злучэнне закаханых у іншым свеце і вечнае жыццё... Людзі-коканы жылі ў чорна-белай прасторы і не ведалі пра каханне, пакуль Ор і Ора ў касцюмах з рукавамі-крыламі не прыляцелі на Зямлю. Каханне, якое пануе вакол іх, абуджае да жыцця вялікі кокан-яйка, адкуль выходзяць Мужчына і Жанчына, Адам і Ева нетрывалага сусвету. Надыходзіць вясна і вяселле. Пасля шумнага свята светлае пачуццё сустракаецца з «бытавухай», амаль разбіваецца аб выспы будзённасці: героі вырываюць з рук надакучлівыя газеты, каструлі і апалонікі кідаюць адно ў другога (літаральна!). Ор і Ора нагадваюць, што каханне мацнейшае за побытавыя непаразуменні. Нашмат складаней пераадолець зайздрасць: былыя госці вяселля атакуюць Мужчыну і Жанчыну, бяруць у палон Ору. Людзям і арлам прыйдзецца прайсці праз шэраг выпрабаванняў. Разам з імі сваю порцыю выпрабаванняў (эмацыянальных і эстэтычных) атрымае глядач, які хоча бачыць фінальны «happy end».

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Выстаўка

# «Паралелі» мастацкага тэкстылю

## Заснавальнікі айчыннай школы прадставілі рэтраспектыву твораў

Сёлета ў Палацы мастацтваў было прэзентавана шмат цікавых выставачных праектаў, якія прадстаўлялі розныя мастацкія кірункі. Аўтары з задавальненнем прымаюць удзел у канцэптуальных выстаўках, распрацоўваюць крэатыўныя ідэі, шукаюць новы шлях да гледача. Некалькі дзён таму на другім паверсе Палаца мастацтваў адкрылася знакавая выстаўка «Паралелі», якая аб'яднала выдатных творцаў мастацкага тэкстылю: Ларысу Густаву, Людмілу Пуцейку, Людмілу Пятруль, Галіну Крываблоцкую і Вольгу Рэднікіну.

Аўтары арганізавалі выстаўку з нагоды юбілеяў. Сёлета Ларыса Густава, Людміла Пуцейка і Людміла Пятруль святкуюць сваё 70-годдзе, а Галіна Крываблоцкая — 40-годдзе творчай дзейнасці. Жаночымі рукамі аўтарак і ствaралася беларуская школа мастацкага габелена.

— Кожны з нас у сістэме выяўленчага мастацтва заняў сваю нішу і здолеў заваяваць аўдыторыю, менавіта таму праект мы і назвалі «Паралелі», — адзначае мастачка Ларыса Густава. — Мы даём публіцы магчымасць убачыць рэтраспектыву, эвалюцыю нашай творчасці: кожная з нас дэманструе ў экспазіцыі як работы ранняга перыяду, так і самыя апошнія кампазіцыі. Мы ніколі не канкурыравалі і заўсёды падтрымлівалі адна адну, менавіта таму ў творах нас можна пазнаць. Наша мастацтва не развіваецца ў адным ключы, яно шматграннае. Мастацкім тэкстылем сёння займаецца і маладое пакаленне, хоць гэты працэс вельмі працаёмкі, складаны. Маладыя мастакі разбіваюць стэрэатыпы, бо ў нашым грамадстве часцяком можна пачуць меркаванне, што габелен састарэў, а аўтары з кожным годам, працуючы над новымі аб'ектамі і раскрываючы праз іх актуальныя тэмы, даказваюць сваю значнасць і перспектыўнасць.

Магчымасць аналізаваць і параўноўваць аўтараў на выстаўцы — важны складнік мастацкага ўспрымання выстаўкі гледачом. Але ж параўноўваць і вылучаць кагосьці асобна дастаткова складана, бо работы кожнага аўтара пранізаны глыбінёй, філасофіяй існавання чалавека ў сучаснасці. Ёсць абсалютна абстрактныя габелены, дзе вызначыць сэнс і ідэю можна толькі дзякуючы колерам, ну а ёсць рэалістычныя, якія раскрываюць тэму краіны. Так, напрыклад, на габеленах Ларысы Густавай прадстаўлены сучасны Мінск. У творах аўтаркі сімваламі горада становяцца храмы. Мастачка выбірае пераважна светлыя колеры, паказвае нам горад чыстым, спакойным. У творах Галіны Крываблоцкай сутыкаемся з народнымі святамі і традыцыямі, беларускай сімволікай. А Людміла Пятруль любіць сумяшчаць абстракцыю з элементамі пейзажа і паказвае ў творах беларускі сялянскі быт.

Асобнай увагі заслугоўваюць габелены самай маладой удзельніцы праекта Вольгі Рэднікінай, якая ў работах шмат увагі ўдзяляе колеравым і светавым нюансам, эксперыментуе з матэрыялам і формамі. Нягледзячы на тое, што Вольга знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку, яна выкарыстоўвае разнастайныя матэрыялы і даследуе магчымасці тэкстыльных тэхналогій. Мастачка сінтэзуе досвед, атрыманы ад прадстаўнікоў беларускай школы мастацкага тэкстылю, і ў той жа час практыкуе наватарскі падыход.



**Людміла ПУЦЕЙКА, «Лясная песня», 1976 г.**

**Вікторыя АСКЕРА**

■ На адкрытай прасторы

# Класіка ў вялікім горадзе

## Мінгарвыканкам сумесна з кампаніяй Velcom распачынаюць серыю канцэртаў каля сталічнай ратушы

Гукі метро, шум машын, рэдкія ноты інструментаў вулічных музыкантаў... Прыкладна такім уяўляецца гукавы «партрэт» сучаснага мегаполіса. Але цягам двух летніх месяцаў, ужо пачынаючы з 8 ліпеня, кожную суботу на плошчы каля сталічнай ратушы можна будзе паслухаць класічную музыку ў выкананні вядомых музыкантаў з Беларусі, Расіі, Літвы, Францыі, Германіі, Нідэрландаў і Германіі. Паслухаць абсалютна бясплатна.

— Сёння Верхні горад стаў адным з самых любімых месцаў мінчан і гасцей сталіцы, — кажа **Алена РАДЗІВОНАВА, прадстаўнік Мінгарвыканкама і мастацкі кіраўнік «Мінскканцэрта».** — Ён аб'яднаў некалькі праектаў, якія дапаўняюць адзін аднаго і даюць магчымасць акунуцца ў атмасферу сучаснага і класічнага музычнага мастацтва. Праект «Класіка ля ратушы», які мы ладзім з кампаніяй Velcom, рэалізуецца ўжо трэці год запар і фактычна становіцца традыцыйным. Важна, каб праект развіваўся, але з улікам праграмы сёлетняга сезона мы бачым добры крок наперад, вечары класічнай музыкі здзівяць нават дасведчаных знаўцаў.

«Класіка ля ратушы» па сутнасці працягвае даўнюю традыцыю, закладзеную ў Мінску яшчэ два стагоддзі таму. Па тагачаснай завядзёнцы кожную нядзелю ўвечары на балкон ратушы выходзіў духавы аркестр, які цягам некалькіх гадзін радаваў гараджан выдатнай музыкай. **Начальнік упраўлення маркетынгу кампаніі Velcom Юлія ДАЙНЕКА** дадае:





— Наша кампанія ўжо некалькі гадоў паспяхова рэалізуе праекты ў сферы падтрымкі дзяцей, нацыянальнай культуры. Падаецца, што класіка ў вялікім маштабе — не тая тэма, якую мы падтрымліваем. Але тут мы пабачылі магчымасць развіцця гарадскога асяроддзя, інфраструктуры, магчымасць ператварыць Мінск у горад, дзе мы не толькі жывём, але і якасна бавім вольны час. Два гады таму, калі ўпершыню ладзілі «Класіку ля ратушы», думалі, што гэта будзе аднаразовы праект. Але пабачыўшы ў адзін з вечароў на плошчы каля 10 тысяч гледачоў, зразумелі, што на гэтай ноце нельга завяршаць справу.

І сапраўды, праграма вечароў класічнай музыкі каля ратушы ўражвае. Распачне серыю канцэртаў Дзяржаўны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь, які сёлета адзначае 90-годдзе. Таксама гледачоў чакаюць тэматычныя праграмы, падчас якіх прагучаць творы Моцарта, Баха, Бетховена, Вівальдзі, Чайкоўскага, Расіні, Пучыні, Шапэна, Штрауса, Кальмана, іншых выдатных кампазітараў. Падчас канцэрта «Гульня ў класікі» музыканты паспрабуюць спалучыць класічную музыку з джазам. Аматараў старога беларускага кіно таксама чакае сюрпрыз. «Беларуская рапсодыя» аб'ядняе музыку з кінафільмаў 1960—70-х гадоў, напісаную айчынным кампазітарам Яўгенам Глебавым.

Адметна, што арганізатары паклапаціліся пра ўтульнасць пляцоўкі і зручнасць прагляду канцэртаў. Так, будзе ўстаноўлены вялікі экран, каб музыкаў маглі бачыць не толькі тыя гледачы, хто знаходзіцца каля сцэны. Для дзяцей арганізуюць спецыяльную пляцоўку. Якасную сувязь забяспечыць мабільная базавая станцыя, устаноўленая на плошчы адмыслова для канцэртаў. Таксама гледачы самі змогуць стаць удзельнікамі шоу. Будуць працаваць два «Свабодныя раялі», зайграць на якіх і паўдзельнічаць у «батле» піяністаў зможа кожны ахвотны. На кожным з канцэртаў гледачоў чакаюць новыя сюрпрызы. Напрыклад, ужо 8 ліпеня наведвальнікі «Класікі ля ратушы» атрымаюць магчымасць зрабіць сэлфі з маэстра Аляксандрам Анісімавым, заслужаным дзеячам мастацтваў Расіі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ За падзеяй

# МУЗЫЧНАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

## Славуты польскі джазавы піяніст выступіў у сталіцы

«Агульная спадчына, досвед жыцця разам у адной дзяржаве, досвед цеснай уніі. Мы наканаваныя адно аднаму. А музыка — ідэальны ключ да дваццаціпяцігоддзя нашых адносін». Такія словы прагучалі падчас сустрэчы з адным з самых яркіх джазавых музыкантаў Польшчы апошніх дзесяцігоддзяў, славутым піяністам Лешакам Можджэрам.

Святочны канцэрт прайшоў у зале Белдзяржфілармоніі з нагоды юбілею дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь. Разам з Дзяржаўным камерным аркестрам Рэспублікі Беларусь на сцэне выступілі вядомыя музыкі сучаснасці — паляк Лешак Можджэр і беларус Кірыл Кедук.

Гралі разам музыкі ўпершыню, але яны ўпэўненыя, што канцэрт прайшоў паспяхова. Лешак аргументуе гэта тым, што ў польскай і беларускай музыкі агульнае паходжанне, ды і яго родныя з Гродна, дзе нарадзіўся і Кірыл. І дадае, што тут ён добра сябе адчувае і вельмі шчаслівы, што яны мелі магчымасць граць разам. Бо музыка — гэта свет, дзе нельга нікому схлусіць. Таму варта граць так, каб кожны беларус і паляк адчуў гэта.

Саветнік пасольства Польшчы ў Беларусі, дырэктар Інстытута польскага ў Мінску Матэўш Адамскі расказваў, што даўно марыў запрасіць Можджэра ў Беларусь, але не думаў, што мара здзейсніцца так хутка. Ідэя для стварэння такога тандэма прыйшла вельмі нечакана, і самі музыкі кажуць, што вырашылі ўсё за пятнаццаць хвілін.

У Мінск Лешак Можджэр завітаў другі раз, мінулы раз быў дзесяць гадоў таму, і ён перакананы, што будзе прыязджаць сюды яшчэ і яшчэ, каб болей любіць Беларусь. Музыкант дадае:

«Мая мара — злучыць свет класікі і джазу. Музыканты баяцца памылкі, а памылка — частка жыцця, яна адкрывае новыя магчымасці. Джаз выкарыстоўвае памылкі. Мы вучымся ў класікаў прыгажосці, а яны ў нас — гарачым эмоцыям».

Кірыл Кедук прызнаўся, што знаёмства з Лешакам стала для яго вельмі знакавай падзеяй. Бо ў Гданьску, дзе жыве цяпер Кірыл і жыў Лешак, яго ведаюць усе. Кірыл расказаў, што Лешак не проста джазавы піяніст, ён перарабляе класічную музыку пад свае матывы, пад свой непаўторны стыль.

**Анастасія АЎХІМОВІЧ**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Кацярына Захарэвіч скончыла Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а сёлета ўзначаліла «Бярозку», і такім чынам стала самым маладым галоўным рэдактарам гэтага часопіса за ўсю больш чым 90-гадовую гісторыю яго існавання.**

**Маладосць — не загана, хоць нехта, пэўна ж, гатовы паспрачацца, падкрэсліваючы, што гаворка ідзе пра пастаянную працу з дзецьмі і падлеткамі: маўляў, такая пасада патрабуе багатага жыццёвага і прафесійнага вопыту. З аднаго боку — як бы і так. А з іншага: гэта калі мы вучыліся ў пачатковых класах, нам здавалася, што ўсе настаўнікі сталыя, з багатым жыццёвым і прафесійным вопытам. А сёння азірнешся на свае школьныя гады, успомніш сваіх любімых настаўнікаў, якія сеялі разумнае, добрае, вечнае, і раптам нечакана для сябе адкрыеш, што былі сярод іх і тыя, хто на той час зусім нядаўна пакінуў універсітэцкія аўдыторыі.**

**Маладосць — не загана, а ў літаратурнай творчасці і пагатоў. І думаецца, што такое настраёвае, светла-шчымлівае апавяданне, якое Кацярына даслала на конкурс «Звязды», можна напісаць толькі ў маладым узросце, калі яшчэ жыве ў душы своеасаблівае, дзівоснае, ні з чым не параўнальнае адчуванне хараства свету, на які пасля, набываючыся таго самага жыццёвага вопыту, мы ўсё часцей глядзім цераз прызму сваіх шматлікіх праблем і клопатаў.**

**Алесь БАДАК.**

Кацярына ЗАХАРЭВІЧ

# МОРЗЭ НА БАРВОВАЙ ТРУНЕ

РЫДЛЁЎКА, ліхтарык, труна, манетка, жменька хлебных крошак. Лішняе закрэсліць, патрэбнае — дапісаць. Здаецца, усё падрыхтаваў, можна рушыць. Манетку ды крошкі — у кішэню, рыдлёўку — у правую руку, ліхтарык — у левую, дзверы адчыніць ілбом, зачыніць — нагой. Стоп. Няма чым несці труну. У кішэні — растрасецца, пакамечыцца, раскрыецца. Рукі — занятыя, што і ні пальца вольнага няма. Выйсце толькі адно.

Максімальна сабраўшы і праглынуўшы ўсю сліну, я ўхапіў труну зубамі. Адчулася, як яны ліпка ўвайшлі ў слой дрэнна застылага лаку. Напэўна, застануцца сляды разцоў — дзве доўгія рысачкі зверху і чатыры кароткія знізу. Цікава, што б прачыталі ў гэтым аматары азбукі Морзэ. Я ўкладаю ў гэтыя рыскі шкадаванне, што ўсё ідзе не так, як запланавана.

Але ў кожным творы кожны чытач бачыць сваё.

Працэсія рушыла пешкі з сёмага паверха. Не ездзіць жа пахаваннем у ліфце. На шостым паверсе я ўсё яшчэ верыў, што ўсё пройдзе без перашкод. Паміж пятым і чацвёртым зачасалася правая лапатка. Упершыню я пашкадаваў, што адзін. Каб быў хто побач, можна было б папрасіць пачасаць, не перарываючы хады. Спыняцца не выпадала — не псаваць жа ўрачыстасць моманту. Не кожны ж дзень хаваеш лепшага сябра. Горыч ад гэтай страты дапаўнялася смакам незастылага лаку. Паміж чацвёртым і трэцім у нос нібы натыркалі маленькіх іголак, захацелася чхнуць і расплакацца. Чхнуць нельга, бо ў што тады ператворыцца мой няшчасны сябар у труне? Я ўявіў, як у чыху сціскаюцца мае зубы, такія вялікія і моцныя для гэтай барвовай каробкі, як напружваецца і лопаецца пад імі яго накормленае цела. Яму ўсё роўна, але любіў яго, занадта любіў, каб так рабіць з ім. Занадта любіў, каб апошнія хвіліны нашага суіснавання былі азмрочаныя агідай. Бо наўрад ці ж ён смачны.

ПАМІЖ трэцім і другім паверхам жаданне чхнуць нарэшце адступіла, так і не спраўдзіўшыся. Затое лапатка засвярбела так, што захацелася — як мядзведзь у смешным відэа з інтэрнэту — стаць і церціся спінай аб сцяну. Але ў нас у пад'ездзе яны гладкія, не атрымаецца. Вось бы зараз вярнуцца ў дзіцячы сад — там сцены былі шурпатыя. У дзіцячым садку мне не падабалася з-за ванючых селядцоў, тоўстай лапшы ў супе і зласлівых дзяцей, якія не любілі пенку ў малацэ. Пенку я заўсёды любіў, бо калі яна чаплялася за вусны і звісала з іх, можна было ўявіць, што гэта вусы, і я дарослы. Але пенкі мне амаль ніколі не траплялася, бо я браў апошні кубак, дзе малака было менш за ўсё. Першыя кубкі разбіралі жорсткія дзеці, якія не любяць пенку. Яны так і не прасачылі ўзаемасувязь паміж чаргой па малако і пенкай.

Каб не думаць пра свярбенне ў лапатцы, я сканцэнтраваўся на смаку лаку. Смак такі шчыльны, што гэта ён, а не труна, не дае закрыць рот. Такі хімічны, што нясцерпна захацелася пазяхнуць. Але пазяхаць нельга. Па-першае, рукі занятыя і няма чым прыкрыць рот. А мама заўсёды вучыла прыкрываць даланёй рот, калі пазяхаеш. Па-другое, калі шырока разявіць рот, то труна выпадзе з яго і...

Я зморшчыўся, уявіўшы, што будзе, наколькі мог зморшчыцца. Халоднае цела на халодных прыступках. А раптам ён разаб'ецца? Разбіты на аскепкі, як ружа, апрацаваная вадкім азотам. Яна была такая прыгожая, такая жывая, а зараз ляжыць, разбітая, на халодным бетоне, і ўсе топчуцца, топчуцца, топчуцца па ёй. Я страсянуў галавой, каб прагнаць гэтае трызненне, і адчуў, як стукаецца аб сценкі труны — цэлы, але халодны, мой сябар.

Я сыходзіў па прыступках, і кожная наступная давалася ўсё цяжэй, хоць і рабіла мяне на крок бліжэй да збавення. Хутка, ужо хутка я кіну — не, асцярожна пакладу рыдлёўку — і пачашу лапатку.

Нарэшце гэтае выпрабаванне скончылася. Я вытрымаў яго з годнасцю — суняў свярбенне толькі калі абставіны дазволілі мне гэта. Уся знешняя лухта, уся мітусня гэтага недасканалага свету адпусцілі мяне, і я быў гатовы перажываць, плакаць, успамінаць, думаць, на каго ж ён мяне пакінуў, і як цяпер жыць без яго — майго адзінага сябра.

Ён зрабіў тое, чаго ніхто ніколі не рабіў — сам прыйшоў да мяне. Я тады быў зусім адзін. Я заўсёды быў адзін, але ў той час — асабліва. Мама паехала ў камандзіроўку на два тыдні, а ў школу я тады вырашыў не хадзіць. Бо малака там не даюць, пенкі, адпаведна, няма, ды і быць дарослым — гэта крыху больш, чым малочныя вусы. Я сядзеў дома, у кампаніі чатырох сцен і мэблі некалькі дзён і ўжо пачынаў лаяцца на фатэль, які, калі на яго плюхацца з разбегу, нібы вожык калючкі, выпускаў балючыя спружыны. Каб раскруціць вожыка, трэба пачасаць яму грыўку, але ў фатэля грыўкі я не знайшоў, таму больш на яго не плюхаўся. Калі чарговы раз прамільгнула здагадка, што фатэль мяне не чуе, і я адчуў сябе зусім-зусім самотным, з'явіўся ён.

ЁН быў руды — і як толькі здагадаўся, што мне падабаецца гэты колер — сонца, восеньскай лістоты і раструшчанага каларадскага жука. Наблізіўся да мяне і прыветна паварушыў вусамі. Я прыветна паварушыў указальным пальцам — мама заўсёды так вітала мяне, прыходзячы пасля сустрэчы з маёй настаўніцай. Ён падпоўз бліжэй і сеў побач. Так мы сядзелі — проста да раніцы. Калі ён прыйшоў другі раз, я падумаў, што мне трэба неяк да яго звяртацца. Я не быў упэўнены, што маю права навешваць на яго нейкі ярлык, хай сабе і імя для зручнасці. На маю прапанову мой сябар станоўча паварушыў вусамі. Мы сышліся на імі Антоній, якое найбольш пасавала да яго шляхетных вусоў.

Мы размаўлялі без слоў: ён — вусамі, я — пальцамі, якія падносіў да вуснаў. Я заўважыў, што і ў мяне пачалі прабівацца вусы, мне вельмі хацелася адказваць яму імі, але яны былі маленькія, і я яшчэ не ўмеў імі варушыць. Каб я быў адзін, то, напэўна, меў бы яшчэ адно расчараванне: вусы растуць — сапраўдныя, а не малочныя, а я не адчуваю сябе дарослым. Але побач са мной быў ён — прусак Антоній, вусаты, але таксама маленькі. Значыць, гэта не я няправільны, значыць, так трэба.

ЁН прыходзіў звычайна па начах. Я не пытаўся, чаму. Мне таксама больш падабалася спаць днём, чым ноччу, але навокал усе былі жаўрукамі і ад мяне патрабавалі быць жаўруком. Можа, гэта жаўруковае крыло свярбела ў мяне сёння ў левай лапатцы? Ён не любіў, калі я ўключаў святло — я таксама больш любіў сядзець у цемры, а мама казала, што я сапсую вочы. Я заўсёды слухаўся маму, таму, раз яна казала, што сапсую, трэба было псаваць.

Я перастаў размаўляць з фатэлем і плюхацца на яго з разбегу. Перастаў нават выглядваць праз акно маму сярод мінакоў. Раней я рабіў гэта заўсёды, хоць ведаў, што прыедзе яна яшчэ не хутка, але ёй было прыемна, калі я распавядаў, як штодзень шукаю яе вачыма. А паколькі падманаваць нельга, я сапраўды садзіўся і чакаў яе ля вакна.

АДНОЙЧЫ яна прыехала. Я, калі шчыра, забыўся, які гэта павінны быць дзень. Прыехала яна даволі позна: было шэсць гадзін ночы. Я б, напэўна, не заўважыў, што мама прыехала, каб яна не абвясціла пра гэта тонкім і вострым, як рапіра, крыкам. Калісьці мяне ўкалолі рапірай, як хадзіў у секцыю фехтавання. Гэта было вельмі балюча, і я вырашыў не хадзіць туды больш. Ад мамінага крыку тая старая рана заныла, заскавытала, і я падумаў, што зноў мяне колюць.

Я выйшаў на кухню, пацiраючы вочы. Я ж прачнуўся хутка, але вочы пра гэта не ведалі і хацелі спаць. Мама ўсё яшчэ папісквала, і рана ад гэтага паторгвала. Пальцам мама паказвала на стол. «Што гэта?» — запыталася, убачыўшы мяне. «Стол», — адказаў я. Выспятак прыляцеў вельмі нечакана і незразумела, за што. Сама вучыла казаць праўду, а зараз б'е. Я вырашыў зголіць вусы, каб не быць дарослым, як яна.

Канчаткова прачнуўшыся, я ўбачыў на стале перавернуты кубак. Запытальна паглядзеў на маму. «Зазірні, зазірні!» — казалі яе вочы. Я падняў пасудзіну. Пад кубкам быў Антоній. Ён ляжаў нерухома. Другая левая лапка была нягегла падвернутая, левы вус быў удвая карацейшы за правы. Гэта ўсё праз мяне.

АНТОНІЙ першы (і я вырашыў, што апошні) адпакутаваў за знаёмства са мной. Я мусіў пахаваць яго — бязвіннага, так, каб запомніць гэта і больш ніколі не дазваляць сабе руйнаваць чыёсьці жыццё.

Запалкавы карабок, пафарбаваны маміным барвовым лакам для пазногцяў, быў труной якраз па памеры Антонія. Ватныя дыскі — ніколі не разумеў, навошта яны маме, а тут спатрэбіліся — сталі майму адзінаму сябру апошнім мяккім ложкам. Пакуль труна сохла, я сядзеў над яго целам, што стала такім бездапаможным і бессэнсоўным, і ўсё яшчэ імкнуўся ўлавіць рух вусіка, лапкі... Зрок быў напружаны, час ад часу здавалася, нібы Антоній сапраўды варушыцца.

Але не. Ён быў мёртвы.

Ён быў мёртвы і тады, калі я адляпіў яго труну ад сваіх зубоў. Цікава, ці засталіся на маіх зубах сляды барвовага лаку. Рысачкі на труне былі нават адчувальныя навобмацак. Адкрыўшы труну, я насыпаў туды хлебных крошак на дарогу і паклаў манетку-капейку. Раптам і з прусакоў патрабуюць за пераправу грошы? Я ўзяў рыдлёўку. У вушах зноў загаварыла мама: «Куды ты панёс срэбраную лыжку?!» Вярну я табе тваю лыжку, вярну. Пакуль капаў, у галаве, ужо набрынялай шкадаваннямі і ўспамінамі, проста грала песня. Я ціхенька падпяваў «Вазьму я лапату» свайму ўнутранаму Лупасіну.

Труна стаяла на горцы толькі што вырытага пяску. Я памятаю, так хавалі дзядулю: паставілі труну на насып побач з магілай, і кожны падыходзіў развітвацца. Тады развіталіся доўга, бо людзей было шмат, а зараз я быў адзін і не ведаў, што можна рабіць з памерлым столькі часу. Я паклаў яго ў магілу і засыпаў. Хацеў пакінуць зверху каменьчык, каб адзначыць месца. Узяў адзін і... спужаўся, што пад ім таксама нехта пахаваны. Раптам пад кожным з каменьчыкаў нехта пахаваны? А колькі іх ляжыць на зямлі... Няўжо тут столькі нябожчыкаў?

Я пабег дадому, імкнучыся не наступаць на камяні, вялікія і маленькія, на горачках і ў ямках. Але ў мяне не атрымлівалася.

Чужыя магілы самі лезлі мне пад ногі.